паказальніках складаюць пераменную інфармацыю курса і пастаянна ўключаюцца для агляду сродкаў ЭВТ на сучасным этапе развіцця.

Гэты падыход, на наш погляд, дазволіць забяспечыць грунтоўную падрыхтоўку спецыялістаў у галіне інфармацыйнай падтрымкі культуры і мастацтва, якія валодаюць трывалымі ведамі і могуць тэхнічна пісьменна выкарыстоўваць лічбавыя ЭВМ у сваёй прафесійнай дзейнасці.

**П.Р.Ігнатовіч,** *дацэнт*

## КУЛЬТУРАЛАГІЧНЫ КАМПАНЕНТ АДУКАЦЫЙНАГА СТАНДАРТА

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У апошнія гады ў нашай краіне вядзецца грунтоўная работа па ўдасканаленні сістэмы адукацыі, уключаючы і вышэйшую школу. Сярод падыходаў, накіраваных на паляпшэнне падрыхтоўкі спецыялістаў, значнае месца займае гуманітарызацыя адукацыі, якая ўключае гуманістычную і культуралагічную місіі. Гэта праяўляецца ў задавальненні духоўных патрабаванняў людзей, канкрэтнага чалавека, канкрэтнай асобы, чалавечых супольнасцей. Такая арыентацыя азначае стварэнне неабходных умоў для развіцця тэарэтычных здольнасцей студэнтаў, гарманічнага развіцця іх інтэлектуальных, прафесійных, эстэтычных і маральных якасцей.

Ключавую ролю ў гуманітарнай падрыхтоўцы студэнтаў маюць веды ў галіне культуралогіі.

Культуралагічная адукацыя спрые асобаснай падрыхтоўцы моладзі да арыентацыі ў сучасным свеце. У працэсе культуралагічнай падрыхтоўкі студэнты павінны атрымаць уяўленні аб шматграннасці і самацэннасці розных культур, іх ролі ў чалавечай жыццядзейнасці, веды аб спосабах набыцця, захавання і перадачы каштоўнасцей

культуры, умець арыентавацца ў асяроддзі сучаснага грамадства, набыць здольнасць удзельнічаць у дыялогу культур, клапаціцца аб захаванні і памнажэнні нацыянальнай культурнай спадчыны.

Трансфармацыя грамадства Рэспублікі Беларусь выклікае глыбокія змяненні ўнутранага свету чалавека, яго сацыякультурных пазіцый, пераваг, арыентацый.

Ва ўмовах, калі разбураецца былая парадыгма каштоўнасцей, калі многія з іх ва ўяўленні часткі людзей змяняюць знак плюс на знак мінус, калі этнічная і рэлігійная ідэнтыфікацыя асобы пачынае набываць прыярытэтнае значэнне, трэба істотна пашыраць ролю культуры (культуралагічнай адукацыі) у сацыялізацыі асобы.

Паспяховае станаўленне беларускай дзяржаўнасці, абнаўленне грамадства немагчымыя без глыбокага вывучэння заканамернасцей культуы наогул і ў прыватнасці беларускай культуры.

Беларуская нацыянальная культура з'яўляецца важнейшым кампанентам сучаснага грамадскага жыцця. Культурны ўзровень грамадзян рэспублікі ў значнай ступені вызначае эканамічныя дасягненні грамадства, яго сацыяльна-палітычную, адукацыйную, духоўную структуру. Свайго рашэння чакаюць разнастайныя праблемы, звязаныя з развіццём нацыі, грамадскай псіхалогіяй, навукай, адукацыяй, літаратурай і мастацтвам, СМІ, рэлігіяй і іншымі бакамі духоўнай вытворчасці.

У краіне зроблены значныя крокі ў галіне сістэматызацыі культуралагічнай падрыхтоўкі студэнтаў, назапашаны пэўны вопыт, маюцца напрацоўкі навукова-метадычнага забеспячэння вучэбнага працэсу.

Значны ўклад у распрацоўку праблем гуманітарнай падрыхтоўкі ўносяць міжнародныя і рэспубліканскія канферэнцыі і семінары, якія штогод (пачынаючы з 1993 г.) праводзяцца Рэспубліканскім інстытутам вышэйшай школы БДУ, Нацыянальным інстытутам адукацыі. Яшчэ ў 1995 годзе распрацаваны праект Адукацыйнага стандарта па

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вучэбным курсе "Культуралогія" для негуманітарных спецыяльнасцей вышэйшых навучальных устаноў. Тады ж выдадзены зборнік "Культуралогія: праблемы выкладання". У 1997 годзе ў Беларускім універсітэце культуры праведзена рэспубліканская навукова-метадычная канферэнцыя на тэму "Культуралагічная падрыхтоўка студэнтаў у сістэме ВНУ". Матэрыялы канферэнцыі апублікаваны ў зборніку (13 друк. арк.).

Сур'ёзная размова па праблемах развіцця гуманітарных навук (у тым ліку і культуралогіі) вялася на рэспубліканскай нарадзе 20 лістапада 1998 года з удзелам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь А.Р.Лукашэнкі.

Важнае значэнне для ўдасканалення сістэмы адукацыі і яе элементаў надаецца стандартызацыі.

Актуальнасць стандартызацыі ў сферы адукацыі абумоўлена:

1) прызнаннем грамадствам і дзяржавай права асобы на выбар шляху атрымання і працяг адукацыі, выбар навучальнай установы і іншыя варыянты;

2) стварэннем сістэмы бесперапыннай адукацыі, якая ўключае комплекс рознаўзроўневых навучальных устаноў, пераходам на шматступеньчатую сістэму адукацыі;

3) уваходжаннем Рэспублікі Беларусь у сусветную адукацыйную прастору, якая патрабуе стварэння механізмаў ацэнкі вынікаў дзейнасці нацыянальнай школы, прызнання дакументаў аб адукацыі, арганізацыі міжнародных педагагічных абменаў і сувязей;

4) назіраемымі ў сучасным свеце тэндэнцыямі да ўладкавання працэсаў функцыянавання розных сістэм, узгаднення іх дзейнасці, у тым ліку ў адукацыйнай сферы, упарадкавання інфармацыйнага працэсу;

5) пераходам на новыя прынцыпы арганізацыі кіравання адукацыяй, якія прадугледжваюць: адмаўленне ад празмернай апекі навучальных устаноў, выкладчыкаў і студэнтаў, аб'ектыўную ацэнку вынікаў дзейнасці на аснове ўстаноўленых крытэрыяў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У адпаведнасці з Адукацыйным стандартам па цыкле сацыяльна-гуманітарных дысцыплін, які распрацаваны Рэспубліканскім інстытутам вышэйшай школы БДУ і ўведзены ў дзеянне загадам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь 6 ліпеня 1999 года (№ 436), культуралогія вызначаецца як дысцыпліна, прадметам вывучэння якой з'яўляецца сістэма ведаў аб культуры, тэорыі і гісторыі культуры, накіраваная на фарміраванне культурна-гістарычнага стылю мыслення, разумення генезісу з'яў сусветнай і айчыннай культуры.

У Адукацыйным стандарце сфармуляваны патрабаванні да ведаў і ўменняў, якімі павінен авалодаць студэнт. У галіне культуралогіі ён павінен

ведаць:

— асноўныя паняцці культуралогіі,

— ключавыя палажэнні і праблемы навукі аб культуры,

— персаналіі культуралагічных ведаў,

— прыкладныя аспекты культуралогіі;

умець характарызаваць:

— культуры мінулага і сучаснасці з пазіцый мнагамернасці,

— культурныя працэсы ў іх канкрэтна-гістарычных абставінах,

— культуру асобы і міжасобасных зносін ва ўмовах разнастайнасці інтэрэсаў і культурнага плюралізму;

умець аналізаваць:

— ролю культуры ў жыцці чалавека,

— асноўныя культурныя эпохі, стылі і ўзоры,

— суадносіны традыцый і інавацый у культуры,

— нацыянальнае і агульначалавечае ў культуры, праблемы міжкультурнай камунікацыі;

— асаблівасці сучасных культурных змен у Беларусі і замежных краінах;

набыць навыкі і якасці:

— міжкультурнай камунікацыі і дыялогу;

— культурнай талерантнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Для павышэння ўзроўню культуралагічнай падрыхтоўкі студэнтаў, дасягнення культуралогіяй адпаведнага статусу неабходна сур'ёзная работа па распрацоўцы навукова-метадычных дапаможнікаў з улікам профілю ВНУ, спецкурсаў, курсаў па выбары, адукацыйных модуляў. Важнай задачай з'яўляюцца распрацоўка, апрабацыя і ўкараненне сучасных тэхналогій навучання.

**М.А.Каралькоў**, *дацэнт*

## РОЛЯ АДУКАЦЫЙНЫХ СТАНДАРТАЎ У ФАРМІРАВАННІ ЭСТЭТЫЧНАЙ КУЛЬТУРЫ СТУДЭНТАЎ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Эстэтыка з'яўляецца філасофскай навукай. Яе выкладанне абапіраецца на даволі строгую метадалогію і высокі ўзровень канцэптуальнасці, што не выключае даступнасці яе выкладання. Але эстэтыку нельга лічыць прыкладной дысцыплінай. Паколькі эстэтыка зарадзілася ў нетрах філасофіі, яна звязана з яе прынцыпамі, кіруецца яе метадамі ў вырашэнні спецыфічных задач.

Мэтамі эстэтычнай адукацыі з'яўляюцца:

— выпрацоўка правільнай каштоўнаснай арыентацыі ў кожнага студэнта;

— навучанне эстэтычнай аргументацыі, уменню абгрунтаваць уласную эстэтычную канцэпцыю;

— фарміраванне здольнасці эстэтычнага самааналізу, разумення асабістых матываў;

— выхаванне здольнасці разумення "эстэтычнага светапогляду" іншых людзей і ўмення ўступаць з імі ў спрэчку (дыскусію);

— фарміраванне пачуццёва-эмацыянальнай сферы, што ў сваю чаргу дае магчымасць замацаваць веды і перавесці іх ва ўпэўненасць;

— выпрацоўка ўмення разумець, даваць правільную ацэнку творам мастацтва: